*Тацяна Рабец*

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНА-СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ХРЫСЦІЯНСКІХ ПЕРСАНАЖАЎ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ЗАМОВАХ

У сістэме жанраў беларускай народнай паэтычнай творчасці замовы – самыя старажытныя па паходжанні. Яны прайшлі складаны і даволі працяглы гістарычны шлях развіцця, зведаўшы на сабе ўплывы розных эпох. Выключна цікавай з’явай у тэкстах усходнеславянскіх замоў з’яўляецца спалучэнне язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў светаўспрымання.

Замовы – з’ява язычніцкага паходжання (тэрмін «язычніцтва» (паганства) упершыню быў прыняты ў царкоўным асяроддзі для абазначэння ўсяго нехрысціянскага, дахрысціянскага). Каб даказаць гэту думку, дастаткова прасачыць адрозненні ў светапоглядных асновах язычніцтва і хрысціянства.

Па-першае, замовы ўзніклі ў перыяд, калі чалавек глядзеў на прыроду, як на сябе: лічыў яе фізічна жывою, надзяляў розныя аб’екты рэчаіснасці розумам, уменнем думаць, гаварыць і мэтанакіравана дзейнічаць. Пры гэтым адухаўленне ўсяго існага на зямлі, у вадзе і на небе суіснавала ў свядомасці нашага продка з верай у магічную сілу слова. Пры дапамозе замоўнага слова чалавек імкнуўся ўступіць у кантакт з адухоўленымі сіламі прыроды, на якія ён хацеў аказаць уплыў, падпарадкаваць іх сабе або выкарыстаць іх моц сабе на карысць. Як адзначае М. А. Янкоўскі, «фактычна з’яўленне замовы было звязана з намаганнем і спробаю першабытнага чалавека пакарыць,

перайначыць і абжыць прыроду, зрабіцца яе ўладаром» [16, *127*]. У сваю чаргу, хрысціянская мадэль свету сцвярджае першародную грахоўнасць чалавека. Чалавек вымушаны пакутаваць у зямным жыцці і імкненне пазбавіцца ад пакутаў – вялікі грэх. Толькі ўсемагутнаму Богу падуладна жыццё чалавека, толькі ён можа змяніць чалавечы лёс.

Па-другое, змагаючыся са злом пры дапамозе замоўнага слова, чалавек у некаторай ступені творыць цуд. Цуды для язычніка былі натуральнай з'явай, кожны чалавек можа зрабіць цуд. У хрысціянстве жа цуды творыць Ісус Хрыстос, а чалавек толькі просіць яго аб гэтым. Цуд для хрысціяніна – гэта нешта таямнічае і магічнае, падуладнае толькі выбраным або святым.

Змяніўся таксама і сам характар замаўлення: у старажытных замовах зварот да сіл прыроды выказаны пераважна ў форме загаду, нярэдка падмацаваны пагрозай, у больш позні час пад уплывам хрысціянства і царкоўнай малітвы ўзніклі замовы ў форме выпрошвання, выклянчвання.

Варта адзначыць, што менавіта ўсходнеславянскія замовы ад хвароб найбольш поўна і яскрава адлюстравалі выказаныя вышэй палажэнні. Агульнавядома, што царква лячэнне хвароб з дапамогай замоў асуджала, лічыла грахом, паколькі, як сцвярджаюць царкоўныя служкі, нядужасць пасылаецца чалавеку ад Бога, «каб абудзіць душу ад сну» або «напомніць пра смерць» [15, *5*]. Свяціцель Феафан Затворнік гаворыць: «Калі ўсё ад Госпада, то і хвароба ваша ад Яго. Калі ўсё ад Госпада да лепшага, то і хвароба ваша» [15, *3*]. У сувязі з гэтым меркаваннем можна ўзгадаць запісаную рускім даследчыкам Г. Паповым легенду, у якой адлюстравана своеасаблівае разуменне сялянамі сутнасці хвароб, іх сувязі з вышэйшымі сіламі і іх антаганістамі (Богам, анёламі, д'яблам). Паводле легенды, хваробы жывуць паміж небам і зямлёй, у хаце з жалеза і сталі, з меднымі дзвярыма, дванаццаццю замкамі, накладзенымі на іх ад Бога пячаткамі і з ключамі ў д'ябла. Калі Гасподзь угнявіцца на чалавека, то пасылае анёла выпусціць адну з хвароб. Анёл прылятае да дома хвароб і здымае пячаткі, а д'ябал адчыняе дзверы і выпускае адну з хвароб. Па ўказанню анёла яна накідваецца на чалавека, якому прызначана захварэць і ідзе з адказам да Бога. Пасля гэтага анёл зноў адводзіць хваробу ў дом хвароб, зачыняе дзверы і накладае на іх пячаткі [8, *16–17*]. Але часцей прычынай хваробы лічылася ўздзеянне нячыстай сілы, якая нападае на чалавека, як толькі Бог адступае ад грэшнікаў. Так, у некаторых мясцінах Смаленшчыны прытрымліваліся такога пераканання, што хваробы знаходзяцца ў непасрэдным веданні д'ябла і жывуць у пекле. Іншыя нават прызнаюць д'ябла бацькам усіх хвароб, якія поўнасцю яму падпарадкоўваюцца. Такія хваробы з'яўляюцца самымі цяжкімі і невылечнымі.

Пералік доказаў можна працягнуць і далей, але і гэтага дастаткова, каб сцвярджаць, што замова – гэта праяўленне язычніцкага светапогляду, а хрысціянскія элементы ў ёй – даніна часу.

Трэба адзначыць, што замовы лічацца жанрам фальклору, для якога характэрна выкарыстанне строга вызначаных моўных формул. У большай ступені гэта звязана з забаронай змяняць тэксты замоў, бо ў такім выпадку

яны страцяць сваю дзейснасць і эфектыўнасць. Таму з увядзеннем хрысціянства архаічныя замоўныя тэксты, як і само выкарыстанне замоў, не маглі знікнуць або карэнным чынам пераўтварыцца. Як адзначае Г. Барташэвіч, «у замовах адбываецца спалучэнне розных па сваёй ідэалагічнай аснове пачаткаў: язычніцкая вера ва ўсёмагутную сілу слова, падмацаванага абрадавым рытуалам або ахвярапрынашэннем у магічных мэтах, вера ў магчымасць уласнымі сіламі дасягнуць мэты, ці то з дапамогай магічных атрыбутаў, ці магутных пасрэднікаў, і хрысціянская пакорлівасць, маленне, упрошванне і надзея на літасць бога» [1, *68*]. У большасці выпадкаў хрысціянская традыцыя закранула не столькі сам дух і сутнасць замовы, колькі яе асобныя фармальныя элементы. Як даводзіў В. Пятроў, «атрыбуты хрысціянскіх персанажаў, прадстаўленых у замовах... вырастаюць зусім не на глебе хрысціянскай сімволікі, а з функцыі дадзенай замовы, аб'екта і мэты замовы, функцыянальнага прызначэння дадзенай замоўнай тэмы і дадзенага вобраза» [7, *105*]. Так, напрыклад, ва ўсходнеславянскіх замовах у якасці персанажаў часам выступаюць хрысціянскія святыя, якія выконваюць тыя ж дзеянні, што здзяйсняліся раней або рознымі міфалагічнымі асобамі, напрыклад, старэнькім, сівенькім дзедам, касцяной (жалезнай, каменнай і інш.) бабай, краснай дзявіцай і г. д., або ўвасобленымі магутнымі сіламі прыроды, і зліваюцца з язычніцкімі ўяўленнямі: вобраз Ісуса Хрыста атаясамліваецца з бажаством дзённага свету Хорсам (або Даждбогам, Купалай, Ярылай); вобраз Багародзіцы набывае рысы язычніцкай Зара-Зараніцы; функцыі Перуна выконваюць у замовах Ілля-прарок, архангел Міхаіл або Георгій Пераможца і г. д. Многія замовы былі абноўленыя ў такой ступені, што ўвайшлі ў склад трэбнікаў (сербскіх і рускіх) XV – XVII стст. як малітвы. Асобныя малітвы – малітвы ад пажару, эпідэмій, граду і інш. – трапілі ва ўніяцкія трэбнікі XVII – XVIII стст. Часам адбываўся і адваротны працэс: царкоўныя малітвы набывалі замоўны характар. Так, напрыклад, Е. Раманаў ў выглядзе замовы прыводзіць скажоны псалом 90-ты [10, *6*].

Ва ўсходнеславянскіх замовах часцей за ўсё змяняліся такія структурныя элементы, як малітоўны пачатак і закрэпка, якія ў большай ступені былі сфарміраваныя пад уздзеяннем хрысціянства. Але да гэтага меркавання трэба ставіцца даволі асцярожна. І ў малітоўным пачатку, і ў закрэпцы сустракаюцца варыянты, пабудаваныя па прынцыпах язычніцкага светаўспрымання (зварот да астральных цел, прадстаўнікоў замагільнага свету і інш.). Хутчэй за ўсё, малітоўны пачатак і закрэпка сучаснага выгляду замянілі ўжо сфарміраваныя да іх ўсталявання уступ і заключэнне язычніцкага характару. На гэта паказвае наяўнасць і пэўнай колькасці «язычніцкіх» малітоўных пачаткаў і закрэпак, для якіх характэрны зварот да сонца, месяца, вады, зямлі, зор-зараніц, дыма, дамавога: укр. *«Сонечко ясне, красне...»* [12, *34*], укр. *«Отець домовий!»* [12, *44*], бел. *«Добры дзень табе, зямля Ева, вада Катарына!»* [3, *379*], рус. *«Заря Дарья, Заря Марья, Заря Катерина, Заря Моремьяна, Заря Вопска...»* [5, *43*].

Варта заўважыць, што структурныя элементы замоў ўсходнеславянскіх народаў у рознай ступені спазналі хрысціянскі ўплыў. Так, рускія замовы амаль поўнасцю запазычылі ў хрысціянскай малітвы пачатак, але захавалі архаічную язычніцкую закрэпку. Акрамя таго, у іх ужываецца найбольшая колькасць імёнаў хрысціянскіх святых. Унутраная, галоўная частка ўкраінскіх замоў засталася нязменнай, але замест замацавання ва ўкраінскіх замовах выкарыстоўваюцца хрысціянскія малітвы. У беларускіх і ўкраінскіх замовах выяўляецца вялікая колькасць разнастайных кантамінацый хрысціянскіх і язычніцкіх формаў малітоўнага пачатку і закрэпкі: *«Господу Богу помолюся, і святому духу, і святому Миколаю, святому Михаїлу і святій Пречистій, святому Вознесінню, святій Покрові, і святому Юрію, і тебе прошу, краснеє сонце, і тебе прошу, ясний місяцю, і вас прошу, зорі-зорениці, Божі помічниці...* [12, *143*], бел. *«Святы Госпадзі, праведны, Ісус Хрыстос нябесны і зоры зарыцкія, і божыя памажніці, і святая матка Прачыстая гасподняга Бога...»* [3, *270*].

Аналізуючы сэнсавае і функцыянальнае прызначэнне хрысціянскіх персанажаў ва ўсходнеславянскіх замовах, можна адзначыць, што адны з іх сустракаюцца пераважна ва ўступнай або заключнай частцы замовы і зварот да іх абумоўлены жаданнем замаўляльніка заручыцца падтрымкай, стварыць надзейную ахову ад варожых з'яў рэчаіснасці або звышнатуральных істот, другія, набываючы рысы найбольш сакральных і магутных сіл прыроды, выконваюць ролю святых заступнікаў, абаронцаў чалавека. Такім чынам, хрысціянскія персанажы з большай ці меншай ступенню ўмоўнасці можна падзяліць на тры групы:

– універсальныя – персанажы, якія выконваюць у замоўным дзеянні функцыі абароны і дапамогі;

– вобразы-памочнікі – персанажы, магічныя здольнасці якіх мабілізуюцца для выканання якога-небудзь пажадання або дапамогі;

– вобразы-абаронцы – персанажы, здольныя нейтралізаваць чужую агрэсію, адмоўнае ўздзеянне шкодных сіл.

Да ліку ўніверсальных персанажаў адносяцца вобразы Ісуса Хрыста, Багародзіцы і Мікалая. Вобразы Багародзіцы і Ісуса Хрыста ва ўсходнеславянскіх замовах маюць выключна хрысціянскае паходжанне. Нягледзячы на тое, што вобраз Ісуса Хрыста часцей за ўсё сустракаецца ва ўступных частках замоў у пары з Багародзіцай або разам з іншымі святымі (Георгіем Пераможцам, Мікалаем Цудатворцам, *«з усімі святочкамі, з гадавымі празнічкамі»* [3, *280*] і інш.), ён можа таксама выступаць самастойна як актыўна дзеючая асоба, што ў большай ступені характэрна для беларускіх замоў: *«Будзець ехаць сам Гасподзь із агнём, із пёрунам, і пасячэць цябе, парубіць, і попел твой па полю разнясець»* [3, *116*]. Ісус Хрыстос выконвае ў замовах вельмі разнастайныя дзеянні: ахоўвае, агароджвае (гэта функцыя колькасна пераважае ўсе астатнія), выганяе, выдаляе, вымятае, выклікае, выбівае, знішчае (разбівае, выпальвае, сячэ і г.д.), адсылае ў іншасвет шкоднікаў/хваробы, спыняе крывацёк, састаўляе

суставы, ачышчае ад хваробы, замаўляе хваробы, лечыць зёлкамі і інш., што дае ўсе падставы адносіць яго да ліку ўніверсальных персанажаў.

Вобраз Багародзіцы ўводзіцца ў замоўны тэкст такім жа чынам, як і вобраз Ісуса Хрыста: ён можа з'яўляцца элементам малітоўнага ўступу, а можа выступаць у ролі актыўна дзеючай асобы, якая або здымае, выбірае, выганяе, адмятае, адграбае, выгрызае, загрызае, абразае, выпальвае, адстрэльвае хваробы, адсылае, адносіць іх у іншасвет, пускае іх на вецер, дорыць іх іншым (функцыя змагара), або замаўляе хваробу, зашывае раны, спыняе крывацёк, тушыць, сцірае, здувае хваробы, насылае сон (функцыя лекара), або даглядае за жывёлай: абмывае, корміць жывёлу, доіць карову (функцыя гаспадара).

У параўнанні з Ісусам Хрыстом і Багародзіцай вобраз Мікалая ва ўсходнеславянскіх замовах сустракаецца значна радзей (зафіксавана толькі 20 выпадкаў ужывання). Аднак нават гэтыя нешматлікія прыклады паказваюць, што персанаж з'яўляецца ўніверсальным: ён выконвае чатыры функцыі: памочніка (бласлаўляе), змагара (вызваляе жывёлу ад ваўкоў, выпальвае, сячэ змей, выбівае, адстрэльвае хваробы), лекара (лечыць, замаўляе хваробы, унімае крывацёк, вылівае валасень) і гаспадара (даглядае за палеткамі, за жывёлай). Функцыянаванне вобраза Мікалая ў замовах ад хвароб, дзе ён выступае ў якасці памочніка і лекара, адлюстроўвае і народны, і царкоўны культы святога: бел. *«І святы вотча Міколачка, ты божжы ўгоднічак, ты скоры памошнічак, ты вялікі малітвеннічак, ты ж скоранька памагаеш, валасень выліваеш і на мхі яго, на балоты ссылаеш»* [3, *223*]. Другі замоўны матыў, з якім звязаны вобраз Мікалая, – матыў дапамогі і абароны ад нячыстай сілы: бел. *«Святы Ягоры-беданосец і святы Міколушка-чудатворац, і Спасіцель і Божжая мацер, так, як вы прэждзе памагалі і нячыстую сілу выбівалі, і пользу давалі, так каб із естага чалавека нячыстую сілу пабілі»* [3, *54*]. Трэці тып замоў, дзе сустракаецца вобраз Мікалая, адлюстроўвае змеяборчы матыў: бел. *«А то не будзеш вынімаць, будзе святы Мікалай рубаці на дванаццаць часцей, у вогненную печ кідаці»* [3, *122*]. У замовах дадзенага тыпу функцыя Мікалая сінанімічная функцыі Георгія Пераможца, Іллі-прарока, Кузьмы-Дзям'яна і Міхаіла-архангела, якія з'яўляюцца абаронцамі, таму становіцца зразумелым, чаму персанаж выступае бел. *з вострым мячом* або рус. *золотым луком*. Вобраз Мікалая таксама сустракаецца ў замовах ад ваўкоў і іншых звяроў, дзе ён дзейнічае разам з Георгіем Пераможцам і Міхаілам-архангелам: бел. *«Прашу я Юр'ю-Ягор'ю і Міколу надзеляюшчага... станьця ка мне на помач...»* [3, *73*], што звязана з народнымі ўяўленнямі пра Мікалая як апекуна земляробства і жывёлагадоўлі.

Хрысціянскія персанажы, якія ўвайшлі ў групу вобразаў памочнікаў, аб'ядноўвае тое, што яны рэдка функцыянуюць самастойна. Утвараючы цэлыя спісы святых, што прызначана ўзмацняць магічную сілу замовы, хрысціянскія вобразы-памочнікі з'яўляюцца пераважна ў пачатку або ў канцы замовы, калі замаўляльнік звяртаецца да іх з просьбай абараніць ад шкоднай сілы або дапамагчы ў розных справах. У якасці памочнікаў часцей

за ўсё выступаюць такія святыя, як Ян Хрысціцель, Панцеляймон, Лука, Уласій, Пётр і Павел, Марк і Матфей, Антоній і Феадосій. Асновай выкарыстання іх вобразаў сталі як царкоўны, так і народны культы святых. Пры гэтым можна заўважыць, што некаторыя з іх (Пётр і Павел, Марк і Матфей, Антоній і Феадосій) адносяцца да ліку «парных» святых, выкарыстанне якіх звязана з культам блізнят. «Ужыванне ў замовах вобразаў “парных” святых, як правіла, прызначана ўзмацніць магічную сілу замовы, падкрэсліць далучанасць замаўляльніка да сакральнага, таямнічага» [9, *369*].

Вобразы, якія выступаюць ва ўсходнеславянскіх замовах у якасці абаронцаў, як правіла, звязаны з культам Перуна. Вобраз старажытнаславянскага Перуна генетычна ўзыходзіць да індаеўрапейскага Бога-грымотніка. У аснове старажытнага індаеўрапейскага міфа ляжыць гісторыя пра змаганнне Бога-грымотніка з хтанічным супраціўнікам, які ўяўляўся ў выглядзе змея. Ядро гэтага міфа захавалася і ў старажытнаславянскай легендзе пра змаганне Перуна з «богам жывёлы» Вялесам. Ва ўсходнеславянскіх замовах Пярун выступае ў адных выпадках як самастойная магутная сіла, супастаўляльная з богам навальніцы, узброеным кап'ём, мячом, стрэламі, камянямі і г.д.: бел. *«...Перун б'ець, малоння паліць, малашніка і малашніцу ад етай скаціны... адкідаець і сваім вострым кап'ём, наскрозь ёй жылы-пажылы прабіваець...»* [3, *62*], у іншых – яго зброя перадаецца ў рукі Бога або святых (Міхаіла-архангела, Юр'я і інш.), якую яны выкарыстоўваюць як сродак пакарання або прамой пагрозы, застрашвання: бел. *«...а то буду прасіць Міхаіла-архангела – ён цябе громам заб'ець, маланнёю спаліць, буйным ветрам попел разнясець»* [3, *113*]. Гэтыя матывы нясуць на сабе адзнакі ўяўленняў розных часоў і дазваляюць прасачыць, якім чынам ішло развіццё або разбурэнне міфалагічных поглядаў і вобразаў.

Па сваіх функцыянальных асаблівасцях ва ўсходнеславянскіх замовах з вобразам Перуна з збліжаюцца на аснове агульнага змеяборчага матыву такія хрысціянскія вобразы-абаронцы, як Георгій Пераможца, Міхаіл-архангел, Ілля-прарок, Кузьма-Дзям’ян, Флор і Лаўр і інш. Змеяборчы матыў стаў асновай выкарыстання гэтых вобразаў у замовах ад нячыстай сілы, вядзьмарства і змей, прычым святыя абаронцы адначасова могуць сустракацца ў адным замоўным тэксце, што прызначана ўзмацняць магічную сілу замовы: бел. *«Святы Ягоры-беданосец і святы Міколушка-чудатворац, і Спасіцель і Божжая мацер, так, як вы прэждзе памагалі і нячыстую сілу выбівалі... так каб із естага чалавека нячыстую сілу пабілі»* [3, *54*]. Думка аб сінаніміі вобразаў святых, якія замяшчаюць змеяборца ў асноўным міфе, неаднаразова прыводзілася ў працах многіх даследчыкаў (гл. [4; 14]). Як адзначае Л. Неўская, «трансформы грымотніка – Гасподзь, Міхаіл-архангел, Георгій, прарок Ілля і інш. – у замове ўжываюцца як абсалютныя сінонімы, і ў выпадку выраджэння тэксту з'яўляюцца адзіным знакам, які ўказвае на залежнасць і вытворнасць замоўнага тэксту ад міфалагічнага...» [6, *71*]. Гэту думку пацвярджае той факт, што ў замовах адбываецца змешванне атрыбутаў святых: Міхаіл, як і Георгій, выязджае на кані: рус. *«Сам Господь Исус*

*Христос вышлет Михаила Архангела на зоре, на белом коне с острым мечом, с огненным должем, будет на вас суд судебный, суд Господний»* [11, *154*]; укр. *«Їхав через поле Михайло Рихайло на білім коні і з гострим мечем через афтитине поле...»* [13, *43*] і, як кавалі Кузьма і Дзям'ян, валодае «жаркім агнём»: бел. *«...**Міхайла** будзець... зялезны кнут куваць...»* [3, *136*]; у сваю чаргу Кузьма і Дзям'ян кіруюць громам і маланкай, як Ілля-прарок: укр. *«Виймай, зія, гостре жало, і як виймеш, то піду до Кузьми і Дем'яна, то Кузьма і Дем'ян і сам Господь пошле на тебе грім і блискавку: грім уб'є, блискавка спалить і пил вітром по полю розвіє»* [2, *281*]. Змешванне функцый Міхаіла на аснове змеяборчага матыву з функцыямі святога Георгія, які адкрывае вясну і з'яўляецца ўладаром нябесных ключоў, а таксама Мікалая, правадыра душ памерлых, уладальніка зямных вод, які мае залатыя ключы, прывяло да таго, што ўсе тры вобразы могуць дзейнічаць у замовах разам: бел. *«Ішоў усемагушчы Гасподзь, святы Мікулай-чудатворац, Геворгі-вялікамучанік пабеданосяц, архістрацігі Міхаілі...»* [3, *327*].

Замяшчэнне культа Перуна культам св. Іллі заснавана на біблейскай легендзе аб Іллі-прароку, які сілай веры выклікаў ахвярны агонь з неба. Знешні выгляд Іллі-прарока і Перуна, а таксама іх атрыбуты – гром, маланка, лук, стрэлы, вогненная калясніца – маюць значнае падабенства. Святому Міхаілу функцыя грамавержца была нададзена на аснове біблейскіх уяўленняў аб Міхаілу-архангелу, які з'яўляецца вярхоўным святым, галоўным анёлам, архістрацігам. На воінскую прыналежнасць Міхаіла ўказваюць як самі імёны святога, так і яго атрыбуты: меч (сталяны, зялезны, востры, огненны і інш.), лукі і стрэлы (тугія), кап'ё (святое, сталяное і інш.), конь (вараны, булатны, буланы, белы і інш.). Кананічная функцыя Михаіла як аднаго з вярхоўных святых адлюстравалася ў замовах ад розных хвароб, прычым найбольшай папулярнасцю карыстаўся вобраз святога менавіта ў беларусаў. Часцей за ўсё архангел Міхаіл ўпамінаецца ў замовах ад змяі, нячыстай сілы і шаленства, у якіх праявіліся як змеяборчы матыў, так і матыў грамавержца. Выключна цікавай з'явай стала выкарыстанне ў замовах ад змей парнага персанажа Кузьмы-Дзям'яна. Уяўленне аб Кузьме і Дзям'яне як першых кавалёў у большай ступені адлюстравана ў беларускіх і ўкраінскіх замовах, звязаных з гаспадарчай дзейнасцю чалавека. Выкарыстанне вобразаў Флора і Лаўра ў замовах заснавана на народным уяўленні пра святых як апекуноў коней і пастухоў. Значная колькасць замоў з вобразам Георгія Пераможца накіравана супраць хвароб людзей і жывёлы, што адпавядае апакрыфічнаму паданню пра святога лекара Георгія. Акрамя таго, адным з асноўных замоўных матываў, у якім прымае ўдзел святы, з'яўляецца матыў абароны ад ваўкоў і звяроў.

Такім чынам, як паказваюць назіранні, група персанажаў, у якую ўваходзяць Ісус Хрыстос, Багародзіца, Марк і Матфей, Пётр і Павел, узнікла выключна пад уплывам хрысціянскага веравызнання. Другія персанажы – Мікалай-ўгоднік, Ян Хрысціцель, Лука, Уласій, Антоній і Феадосій – адлюстравалі і народны, і царкоўны культы святых. На прыкладзе выкарыстання ва ўсходнеславянскіх замовах вобраза Антонія можна

прасачыць змешванне царкоўных культаў двух святых: Антонія Вялікага і Антонія Пячэрскага.

Праведзены параўнальны аналіз вобразаў святых у беларускіх, рускіх і ўкраінскіх замовах паказвае іх значнае падабенства і выяўляе толькі адзінкавыя выпадкі несупадзення семантыка-функцыянальных характарыстык вобразаў. Напрыклад, вобразы Антонія і Феадосія найбольш характэрны для ўкраінскіх замоў, у меншай ступені – для беларускіх, а ў рускіх замовах яны амаль не сустракаюцца. Вобраз святога Уласія зафіксаваны толькі ў беларускіх і рускіх замовах: у замовах, накіраваных супраць хвароб жывёлы і на дарогу.

На падставе вышэй сказанага можна прыйсці да высновы, што ва ўсходнеславянскіх замовах мы маем магчымасць назіраць вынікі двухвер'я, як пэўнага светапогляду, які спалучае ў сабе элементы хрысціянскай дагматыкі і язычніцкай міфалогіі. У дадзеным выпадку гэта не проста сінтэз дзвюх сістэм вераванняў з іх глыбокім узаемапранікненнем, а наяўнасць пэўнага этнапсіхалагічнага феномена: чалавек аб'яднаў у сваёй свядомасці дзве міфалагічныя сістэмы (хрысціянскую і язычніцкую), але пры гэтым надзяліў персанажы той і іншай сістэмы агульнымі якасцямі і ўласцівасцямі, а самому замоўнаму дзеянню надаваў камунікатыўную (характэрнай для язычніцтва), «дазвольную» і «засцерагальную» (характэрныя для хрысціянства) функцыі.

**ЛІТАРАТУРА**

1. *Барташэвіч, Г. А.* Магічнае слова : вопыт даследавання светапогляднай і мастацкай асновы замоў / Г. А. Барташэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990.

2. Ви, зорі-зориці... : українська народна магічна поезія (замовляння) / упоряд. М. Г. Василенка, Т. М. Шевчук. – Київ : Молодь, 1991.

3. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў Г. А. Барташэвіч; рэдкал. : А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – Мінск, 1992.

4. *Иванов, В. В.* Инвариант и трансформация в мифологических и фольклорных текстах / В. В. Иванов, В. Н. Топоров // Типологические исследования по фольклору : сб. ст. памяти В. Я. Проппа (1895–1970) / Ин-т востоковедения АН СССР ; ред. В. Я. Пропп, Е. М. Мелетинский. – М., 1975. – С. 44 – 76.

5. *Майков, Л. Н.* Великорусские заклинания // Записки Императорского Русского Географического общества по отделению этнографии. – СПб, 1869.

6. *Невская, Л. Г.* О заговорной реализации одного эпизода основного мифа / Л. Г. Невская // Этнолингвистика текста. Семиотика малых форм фольклора : тезисы и предварит. материалы к симпозиуму / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР ; ред. В. В. Иванов. – М., 1988. – Т. 1. – С. 69 – 72.

7. *Петров, В. П.* Заговоры / В. П. Петров ; публ. А. Н. Мартыновой // Из истории русской советской фольклористики. – Ленинград, 1982. – С. 77 – 142.

8. *Попов, Г.* Русская народно-бытовая медицина : по материалам этнографического бюро князя В. Н. Тенишева / Г. Попов.– М. : Глобус, 1991.

9. *Рабец, Т. Д.* «Парныя» святыя ва ўсходнеславянскіх замовах / Т. Д. Рабец // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі : у 2 ч. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2006. – Ч. 1 : Мастацтвазнаўства, фальклор і этналогія. – С. 368 – 375.

10. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник : в 9 вып. / Е. Р. Романов. – Витебск : Тип. Г. А. Малкина, 1891. – Вып. 5 : Заговоры, апокрифы и духовные стихи.

11. Русские заговоры и заклинания : материалы фольклорных экспедиций 1953 – 1993 / Моск. гос. ун-т ; ред. В. П. Аникин. – М. : Изд-во МГУ, 1998.

12. Українські замовляння / упорядник М. Н. Москаленко, автор передмови та коментаря М. О. Новикова. – Київ, 1993.

13. Українські чари / упоряд. О. М. Таланчук. – Київ : Либідь, 1994.

14. *Успенский, Б. А.* Филологические разыскания в области славянских древностей : (реликты язычества в восточнославянском культе Николая Мирликийского) / Б. А. Успенский. – М. : Изд-во МГУ, 1982.

15. *Феофан Затворник.* Болезнь и смерть. Выдержки из писем / Феофан Затворник. – М. : Издательский отдел Владимирской епархии, 1996.

16. *Янкоўскі, М.А.* Замовы / М. А. Янкоўскі // Беларуская народна-паэтычная творчасць / пад рэд. М. Р. Марчанкі. – Мінск, 1979. – С. 127 – 135.